**Я. В. Есіс**

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

## ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЎРОКАЎ

## 8 клас

**(II паўгоддзе)**

Дапаможнік для педагогаў устаноў
агульнай сярэдняй адукацыі

М а з ы р
«Выснова»
2 0 2 1

# АД АЎТАРА

Выданне складаецца з 30 планаў-канспектаў урокаў па беларускай літаратуры ў VIII класе на II паўгоддзе. Матэрыял пададзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання «Беларуская літаратура. VIII клас» (Мінск: НІА, 2018).

У дапаможніку прадстаўлены ўрокі па раздзелах «Эпічныя жанры», «Ліра-эпічныя жанры», «Драматычныя жанры», «Паўтарэнне і падагульненне вывучанага», якія прысвечаны аналізу праграмных мастацкіх твораў для чытання і вывучэння, твораў для дадатковага чытання, удасканаленню пісьмовага маўлення вучняў (творчыя ўрокі).

Прапанаваныя распрацоўкі ўрокаў пабудаваны ў залежнасці ад тэмы, накіраваны на рэалізацыю пастаўленай мэты і дасягненне акрэсленых задач. Планы-канспекты распрацаваны з улікам патрабаванняў адукацыйнага стандарту і канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура», увага скіравана на рэалізацыю кампетэнтнага падыходу ў вывучэнні айчыннага слоўнага мастацтва.

Метадычныя распрацоўкі носяць рэкамендацыйны характар. З прапанаванага дапаможніка настаўнік зможа выбраць неабходнае і патрэбнае, на яго думку, з улікам узроўню падрыхтаванасці вучняў.

Матэрыял будзе карысны настаўнікам беларускай літаратуры, студэнтам філалагічных факультэтаў (па спецыяльнасці «Беларуская філалогія»).

# ЯКУБ КОЛАС. АПАВЯДАННЕ «ХМАРКА»

**Мэта:** мяркуецца, што напрыканцы ўрокаў вучні:

***будуць ведаць:*** ідэйна-мастацкі змест і сюжэт апавядання «Хмарка» Я. Коласа, яго вобразны склад;

***авалодаюць паняццямі:*** эпічныя жанры;

***удасканаляць навыкі:*** работы з апорнай табліцай, з мастацкім творам (эпічным).

**Задачы выхавання і развіцця асобы вучняў:** стварыць умовы для непрымання пачуцця эгаізму, самалюбавання, абыякавасці да таго асяроддзя, дзе нарадзіўся, разуменне свайго абавязку перад ім; развіцця інтэлектуальных здольнасцей, аналітычнага мыслення вучняў, навыкаў слухання і канспектавання; садзейнічаць выхаванню маўленчай культуры вучняў.

**Абсталяванне:** партрэт Якуба Коласа; выстава кніг апавядання «Хмарка» розных гадоў выдання; відэаролік «Эпічныя жанры»; ілюстрацыі вучняў (на ўрок 25).

**Эпіграф:** Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я... (Якуб Колас)

## Ход урока

### I. Арыенціровачна-матывацыйны этап

**1.1.** Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.

**1.2.** Актуалізацыя раней вывучанага.

— Назавіце сапраўднае імя Якуба Коласа.

— Дзе і калі нарадзіўся паэт?

— Кім быў яго бацька?

— Працягніце выраз: «Ніхто з дамашніх не згадае, чым рэчка...».

— Чаму 1906 год лічыцца пачаткам літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа?

— Які твор Якуба Коласа называюць энцыклапедыяй беларускага сялянства?

— Як звалі галоўнага героя-музыку ў адной з паэм Якуба Коласа?

— Назавіце цыкл алегарычных апавяданняў Якуба Коласа, створаных у перыяд з 1906 па 1956 гады.

**1.3.** Мэтавызначэнне.

Вучні самастойна фармулююць мэты ўрока, запісваюць у свае сшыткі, працягнуўшы выразы:

*даведаюся... *вызначу... *выкарыстаю...

## II. Пазнавальны этап

**2.1.** Паглыбленне ў тэорыю літаратуры.

А. Дэманстрацыя відэароліка «Эпічныя жанры».

Б. Работа з вучэбным дапаможнікам. Чытанне артыкула «Эпічныя жанры».

В. Складанне апорнага канспекта.

(Агучваюцца вынікі работы.)

**2.2.** Слова настаўніка.

— Якуб Колас... Імя беларускага слыннага песняра з'яўляецца пуцяводнай зоркай у беларускай літаратуры XX стагоддзя. Яго творчасць — гэта жыватворная крыніца жыцця. Сёння мы зноў вяртаемся да асобы Якуба Коласа са словамі вялікай удзячнасці за тое, што ён сваімі творамі вучыць нас, сучасных беларусаў, любіць родны край, шанаваць роднае і адзінае, разумець жыццё ва ўсёй яго непрадказальнасці, таямнічасці і загадкавасці.

**2.3.** Калектыўнае каменціраванае чытанне апавядання «Хмарка» Я. Коласа.

**2.4.** Тлумачэнне сэнсу незразумелых слоў.

**2.5.** Вывучэнне першаснага чытацкага ўспрымання.

— Якое ўражанне выклікаў у вас прачытаны твор?

— Які момант у творы вас найбольш уразіў / усхваляваў / абурыў? Чаму?

**2.6.** Хвілінка адпачынку.

**2.7.** Гутарка.

— На колькі кампазіцыйных частак можна падзяліць твор? Агучце іх.

— Назавіце галоўных герояў твора.

— Давайце паспрабуем ахарактарызаваць іх. На аснове прачытанага запоўніце апорную табліцу:

# ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская літаратура: зборнік творчых заданняў для тэматычнага кантролю: 5—9 класы : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / І. М. Гоўзіч [і інш.]. — Мінск: Аверсэв, 2012. — 159 с.

2. *Бугаёў, Д. Я.* Вывучэнне творчасці Васіля Быкава ў школе : дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі / Д. Я. Бугаёў, М. І. Верціхоўская, В. У. Верціхоўская. — Мінск: Аверсэв, 2005. — 284 с.

3. *Есіс, Я. В.* Беларуская літаратура: планы-канспекты ўрокаў. 8 клас (II паўгоддзе) : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / Я. В. Есіс. — Мазыр: Белы Вецер, 2017. — 68 с.

4. *Ішчанка, Г. М.* Вывучэнне творчасці пісьменніка: Уладзімір Караткевіч у школе : дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў / Г. М. Ішчанка. — Мінск: Аверсэв, 2002. — 207 с.

5. *Карухіна, В. А.* Урокі беларускай літаратуры ў 8 класе : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання / В. А. Карухіна, П. І. Лявонава, І. М. Слесарава. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2006. — 214 с.

6. *Лявонава, П. І.* Беларуская літаратура ў 8 класе : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / П. І. Лявонава, В. І. Русілка, І. М. Слесарава. — Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2012. — 184 с.

7. *Лявонава, П. І.* Беларуская літаратура ў пытаннях і адказах. 9 клас : дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / П. І. Лявонава, Л. Я. Цвірко. — Мінск: УніверсалПрэс, 2006. — 256 с.

8. *Лявонава, П. І.* Беларуская літаратура. 8 клас: тэставыя і тэматычныя заданні : дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання / П. І. Лявонава, І. М. Слесарава. — Мінск: ТэтраСістэмс, 2005. — 128 с.

9. *Ляшук, В. Я.* Вывучэнне творчасці Кандрата Крапівы ў школе : дапаможнік для настаўнікаў / В. Я. Ляшук, М. І. Яніцкі. — Мінск: Аверсэв, 2007. — 192 с.

10. *Ляшук, В. Я.* Вывучэнне творчасці Якуба Коласа ў школе : дапаможнік для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. — Мінск: Аверсэв, 2006. — 320 с.

11. *Пінголь, І. А.* Беларуская літаратура. 8 клас: дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / І. А. Пінголь. — Мінск: Сэр-Віт, 2019. — 40 с.

12. *Русілка, В. І.* Незвычайнае літаратуразнаўства: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы. 8 клас : дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання / В. І. Русілка. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010. — 64 с.

13. Урокі беларускай літаратуры. 9 клас : дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання: у 2 ч. Ч. 2 / [удклад. і аўт. прадмовы В. А. Ганжына]. — Мазыр: Белы Вецер, 2006. — 134 с.

---

# ЗМЕСТ

Ад аўтара . . . . . . . . . . 3

Урокі 24—25. Якуб Колас. Апавяданне «Хмарка» . . . . . . . . . . 4

Урок 26. Уладзімір Караткевіч. Апавяданне «Паром на бурнай рацэ». Пісьменнік і гісторыя . . . . . . . . . . 10

Урокі 27—28. Уладзімір Караткевіч. Апавяданне «Паром на бурнай рацэ». Вобразы герояў твора . . . . . . . . . . 15

Урок 29. Уладзімір Караткевіч. Апавяданне «Паром на бурнай рацэ». Маральны аспект твора . . . . . . . . . . 20

Урок 30. Творчая работа. Апавяданне апісальнага характару (на аснове апавядання «Паром на бурнай рацэ» У. Караткевіча) . . . . . 24

Урокі 31—32. Генрых Далідовіч. Апавяданне «Губаты» . . . . . . . . 26

Урокі 33—34. Васіль Быкаў. Аповесць «Жураўліны крык». Першае знаёмства з героямі твора . . . . . . . . . . 32

Урокі 35—36. Васіль Быкаў. Аповесць «Жураўліны крык». Раскрыццё характараў герояў у трагічных абставінах . . . . . . . . . . 36

Урок 37. Васіль Быкаў. Аповесць «Жураўліны крык». Паглыбленая характарыстыка герояў . . . . . . . . . . 41

Урок 38. Васіль Быкаў. Аповесць «Жураўліны крык». Маральны выбар і вернасць . . . . . . . . . . 45

Урок 39. Творчая работа. Разважанне апісальнага характару (на аснове аповесці «Жураўліны крык» В. Быкава) . . . . . . . . . . . . . . 49
Урок 40. Урок дадатковага чытання. Уладзімір Караткевіч. Аповесць «Лісце каштанаў» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Урокі 41—42. Янка Купала. Паэма «Магіла льва» . . . . . . . . . . 54
Урокі 43—44. Янка Купала. Паэма «Магіла льва». Характарыстыка Машэкі і Наталькі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
Урок 45. Янка Купала. Паэма «Магіла льва». Гуманістычны пафас твора . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Урок 46. Творчая работа. Рамантызаваныя вобразы галоўных герояў (на аснове паэмы «Магіла льва» Я. Купалы) . . . . . . . . . . 68
Урок 47. Аркадзь Куляшоў. Балада «Маці» . . . . . . . . . . . . . . . 70
Урок 48. Кандрат Крапіва. Байкі «Ганарысты Парсюк» і «Дыпламаваны Баран» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Урок 49. Янка Купала. Камедыя «Паўлінка» . . . . . . . . . . . . . . 79
Урок 50. Янка Купала. Камедыя «Паўлінка». Вобразы Паўлінкі і Якіма Сарокі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Урок 51. Янка Купала. Камедыя «Паўлінка». Высмейванне шляхецкай пыхлівасці і духоўнай абмежаванасці . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Урок 52. Янка Купала. Камедыя «Паўлінка». Абагульняючы ўрок 92
Урок 53. Паўтарэнне і падагульненне вывучанага . . . . . . . . . . 98
*Літаратура* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106